# Юныя шахматысты і гімнасты на прыёме ў тав. Н. М. Галадзеда

31 сакавіка адбылася сустрэча пераможцаў дзіцячага ўсебеларускага гімнастычнага свята і шахматна-шашачнага турніра з старшынёй СНК БССР тав. Галадзедам.

Пры сустрэчы прысутнічалі намеснік старшыні СНК БССР тав. Саак'ян, нарком асветы БССР тав. Чарнушэвіч, старшыня ЦСПСБ тав. Кавальчук, і другія таварышы.

Маленькі Ентаў рапартуе Нікалаю Матвеевічу, што яны прышлі расказаць аб выніках гімнастычнага свята і шахматна-шашачнага турніра і параіцца аб шляхах сваёй далейшай работы.

Тав. Галадзед вітаецца з прыбыўшымі рэбятамі. Пачынаецца ажыўлёная гутарка. Тав. Галадзед (які, дарэчы, сам добра іграе ў шахматы) пытае пераможцаў шахматнага турніра аб шляхах, якімі яны прышлі да перамогі.

Гімнастка Аксёнава (Менск) расказала аб выніках гімнастычных спаборніцтваў сярод дзяўчат. Вера Тафтуто (Віцебск) перадала, як яна заняла першае месца спынілася на ўмовах падрыхтоўкі да спартакіяды.

Але гімнастыка, шахматы, шашкі для рэбят не галоўнае. Усе яны вучацца на адзнаку «добра» і «выдатна». Аб выніках вучобы расказваюць Казакова і Юдэльзон.

Нікалай Матвеевіч падводзіць вынікі гутаркі. Ен адзначае:

— Вельмі добра, што ў часе канікул праведзена гэта свята, вельмі добра, што рэбяты займаюцца гімнастыкай, займаюцца шахматамі і шашкамі. Звычайна шахматысты — добрыя матэматыкі, а матэматыкі патрабуе кожная тэхнічна-інжынерная справа. Юныя гімнасты, шахматысты і шашысты павінны звярнуць асаблівую ўвагу на асваенне агульначалавечай культуры.

Далей тав. Галадзед заастрае ўвагу рэбят на пытаннях барацьбы з хуліганствам у школах, на павышэнні класавай пільнасці.

У заключэнні т. Галадзед пажадаў рэбятам абавязкова вырасці канкурэнтамі Батвініку, Ласкеру і Флору, абавязкова абагнаць Лядумега і паведаміў, што СНК БССР прэміруе ўсіх пераможцаў гімнастычнага і шахматна-шашачнага спаборніцтваў.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ